ЮБІЛЕІ

# Выдатны вучоны-гісторык і педагог

## (Да 60-годдзя з дня нараджэння Мікалая Уладзіміравіча Смяховіча)

Мікалаю Уладзіміравічу Смяховічу, кандыдату гістарычных навук, загадчыку Цэнтра гісторыі індустрыяльнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі ў студзені споўнілася 60 гадоў.

М. У. Смяховіч нарадзіўся ў мястэчку Дзівін на Берасцейшчыне ў сялянскай сям'і. З дзяцінства ён прывык шанаваць кнігу як крыніцу мудрасці. Калі бацька, які меў толькі адзін клас адукацыі, казаў яму, што «кніга цябе, сынку, карміць не будзе», дык потым, калі ў 1970 г. Мікалай паступіў вучыцца ў Мінскі педагагічны інстытут, Уладзімір Арцёмавіч змайстраваў адмысловую этажэрку для кніг і ганарыўся поспехамі сына. Вучоба ў інстытуце студэнту М. Смяховічу давалася лёгка: амаль усе экзамены былі здадзены ім на «выдатна». Акрамя таго, ён прымаў актыўны ўдзел у навуковым жыцці факультэта. На працягу трох гадоў узначальваў вучэбную студэнцкую камісію. На I курсе інстытута за лепшую навуковую працу на Усесаюзным конкурсе студэнцкіх работ па грамадскіх навуках ён атрымаў Дыплом I ступені. Падобныя ўзнагароды атрымліваў і ў наступныя гады навучання ў інстытуце.

Вялікі ўплыў на жаданне М. Смяховіча стаць прафесійным гісторыкам-навукоўцам зрабілі выкладчыкі інстытута — доктар гістарычных навук В. І. Гарамыкіна, якая кіравала яго курсавой работай па гісторыі старажытнага часу, і доктар гістарычных навук А. П. П'янкоў, які выкладаў гісторыю СССР. З вялікім задавальненнем Мікалай Уладзіміравіч слухаў лекцыі па археалогіі, якія цікава і натхнёна чытаў доктар гістарычных навук Г. В. Штыхаў.

Студэнцкае жыццё не абмяжоўвалася толькі вучобай. Мікалай Уладзіміравіч прымаў актыўны ўдзел у шматлікіх спартыўных мерапрыемствах, шматразова працаваў у студэнцкім будаўнічым атрадзе. З цеплынёй і павагай успамінае Мікалай Уладзіміравіч сваіх сяброў-аднакурснікаў — доктара культуралогіі Уладзіміра Мартынава, кандыдатаў гістарычных навук Пятра Русава, Сяргея і Івана Шаўрукоў.

Атрымаўшы дыплом з адзнакай, малады спецыяліст з 1974 г. да 1978 г. працаваў дырэктарам Слабадской няпоўнай сярэдняй школы Пухавіцкага раёна. У 1978 г. М. Смяховіч быў прызваны на службу ў Савецкую Армію, дзе таксама праявіў свае здольнасці. Так, 18 верасня 1979 г. армейская газета «Воздушный часовой» адзначала, што выступленні агітатара ўзвода радавога М. Смяховіча «заўсёды падабаюцца воінам, пакідаюць у іх душы глыбокі і добры след. Актывіст здольны растлумачыць складаныя пытанні міжнароднага жыцця, патрабавальна ацаніць уклад кожнага таварыша па службе ў далейшае павышэнне пільнасці і баявой гатоўнасці».

Пасля заканчэння службы ў арміі з лістапада 1979 г. Мікалай Уладзіміравіч працаваў настаўнікам гісторыі сярэдняй школы № 116 г. Мінска, у 1980 г. быў выбраны адказным сакратаром Фрунзенскай раённай арганізацыі Добраахвотнага таварыства аматараў кнігі БССР. На гэтай пасадзе шмат часу надаваў вывучэнню літаратуры, у першую чаргу — гістарычнай. У 1985 г. перайшоў на працу ў Мінскі кааператыўны тэхнікум, дзе выкладаў грамадскія дысцыпліны.

З 1987 г. юбіляр працаваў на розных пасадах у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. У 1992 г. пад кіраўніцтвам А. М. Грыгор'евай абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Работа дзяржаўных, палітычных і грамадскіх

арганізацый Беларусі па жыццеўладкаванні дзяцей, якія засталіся без бацькоў (1943—1950 гг.)». Мікалай Уладзіміравіч плённа спалучаў выкладчыцкую і навуковую дзейнасць і ў верасні 1997 г. за шэраг навуковых прац па гісторыі Беларусі стаў лаўрэатам прэміі БДПУ імя Максіма Танка. У 2002 г. М. Смяховіч перайшоў на выкладчыцкую работу ў Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва. З верасня 2005 г. Мікалай Уладзіміравіч працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Шаноўны юбіляр папоўніў скарбонку беларускай гістарыяграфіі цікавымі арыгінальнымі даследаваннямі, што атрымалі прызнанне як у рэспубліцы, так і за яе межамі. Яго пяру належыць больш за 100 навуковых публікацый, якія прысвечаны вывучэнню актуальных праблем айчыннай гісторыі і метадалогіі гісторыі, у тым ліку: адна індывідуальная работа — «История и метод» (2004) і 5 калектыўных манаграфій: «Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе» (Мінск, 2008), «Философия и идеология жизнедеятельности Беларуси: теоретические основы антикризисной модели и механизмы её реализации» (Минск, 2009), «Институт истории Национальной академии наук Беларуси (1929—2009 гг.)» (Минск, 2009), «Беларусь: народ. Государство. Время» (Минск, 2009), «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XX ст.» : у 2 кн. — Кн.1. — Мінск, 2011.

М. Смяховіч надае вялікую ўвагу папулярызацыі гістарычных ведаў, выступае з цікавымі і змястоўнымі артыкуламі на старонках перыядычных выданняў, на радыё і тэлебачанні, на шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях, семінарах і сімпозіумах.

Навуковая грамадскасць, калегі і сябры шчыра і сардэчна віншуюць шаноўнага Мікалая Уладзіміравіча з юбілеем і ад усёй душы жадаюць яму моцнага здароўя, творчага плёну і поспеху ў здзяйсненні ўсіх яго планаў.

**В. Г. Мазец**,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі,
**М. Б. Несцяровіч**,
кандыдат гістарычных навук,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі